*У. А. Жылко, аспірант.*
*Навуковы кіраўнік – А. І. Смолік,*
*доктар культуралогіі, прафесар*

# ІДЭАЛ МІНУЎШЧЫНЫ ЯК АБ'ЕКТ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАГА РАМАНТЫЗМУ XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблемы духоўнай культуры набываюць незвычайную актуальнасць, што непасрэдным чынам звязана з асаблівасцямі сучаснай культурнай эпохі, для якой у пэўнай ступені характэрны своеасаблівы адыход ад духоўнасці, які прадугледжвае пасіўную энтрапію духоўных патэнцый. Усё гэта дыктуе неабходнасць паглядзець на айчынную гісторыю і культуру з пазіцыі духоўна-маральнага пачатку. У гэтым дачыненні падаецца надзвычай апраўданым звярнуцца да даследавання феномена беларуска-польскага рамантызму XIX ст., паколькі рамантычная творчасць пісьменнікаў можа прапанаваць багаты матэрыял для даследавання аб'ектаў духоўнай культуры.

Пад аб'ектамі духоўнай культуры мы будзем разумець культурныя феномены, выражаныя ў ідэальнай форме: ідэі, вераванні, вобразы, ідэалы, каштоўнасці. У межах нашай працы спынімся непасрэдна на такім аб'екце, як ідэал, а дакладней – ідэал мінуўшчыны, паколькі дадзеная катэгорыя займае вызначальнае месца ў межах рамантычнага светапогляду. Ідэал можна вызначыць як ідэальны вобраз, які мае нарматыўны характар і вызначае паводзіны і дзейнасць людзей. Ідэалы – важкія элементы светапогладу, якія поруч з ідэямі, канцэптуальнымі вобразамі ствараюць пэўную карціну свету і чалавека [3, с. 36]. Арыентуючыся на ідэалы, чалавек вызначае мэты і задачы жыцця,

практычнага пераўтварэння свету і сябе. Найперш гэта назіраецца праз супрацьпастаўленне рэальнага і ўяўнага свету. Рэчаіснасць з яе ўтылітарнасцю і бездухоўнасцю адмаўляецца прадстаўнікамі рамантызму, замест яе сцвярджэнне набывае ўяўны свет, «іншасвет», ідэальны свет. У якасці такога ідэальнага свету, адлюстраванага ў творчасці прадстаўнікоў рамантычнай традыцыі, выступае мінуўшчына (як далёкая, так і блізкая, як уяўная, сімвалічная, так і гістарычна даставерная), якая ў культурных тэкстах у некаторай ступені з’яўляецца ўзорам для пераймання.

Прадстаўнікі беларуска-польскага рамантызму часта вяртаюцца ў мінулае з мэтай пошуку ідэальнага свету. Творчай канцэпцыі Яна Баршчэўскага, напрыклад, уласціва ідэалізацыя маладосці як найбольш яскравага і бесклапотнага перыяду жыцця:

«Найпрыемнейшы ў жыцці чалавека час – вясна маладосці, калі, раскрываючы кветку свайго розуму, ён дае волю лятункам, песціць у сэрцы вялікія надзеі, < … > гэтая шчасная пара мае дзіўную прывабнасць, дорыць чалавеку адчуванне нейкіх незвычайных райскіх уцех» [1, с. 141].

«Калі малады, зямля – рай, усюды дзівосы» [1, с. 137].

Дадзены прыклад ідэалізацыі мінулага жыцця героя пісьменніка абумоўлены не толькі інтымнымі перажываннямі, ідэал былой маладосці непасрэдным чынам атаясамліваецца Я. Баршчэўскім з аксіялагемай Радзімы, роднага краю, дзе прайшлі маладыя гады, і тым самым выходзіць за межы свядомасці аднаго суб’екта, пераадольваючы першапачатковую абмежаванасць свайго зместу, набывае значнасць у межах нацыянальнай супольнасці:

«Край, дзе чалавек жыў у шчаслівую пару свае маладосці <…> заўсёды паўстае ў найпрыгажэйшых колерах; там, здаецца, яшчэ не скончыўся той залаты век, калі чалавек не разумеў, што такое нядоля і пакуты, і рэчкі там з малака і мёду» [1, с. 136].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Я. Чачот, як і Я. Баршчэўскі, ідэалізуе сваю маладосць, менавіта яе філамацкі перыяд:

Зноў вярнуць вякі б нам тыя,
Калі рэкамі ліліся
Малако, мяды густыя,
Людзі соладка жылі ўсе.
Сэрцы ў іх былі – бы з мёду,
Чысціні малочнай – душы.
Чорных дзён не зналі з роду,
Смутак дум іх не цярушыў [5, с. 28].

Ідэал залатога веку ў большасці прадстаўнікоў беларуска-польскага рамантызму ўзыходзіць не да першапачатковага ў часавым вымярэнні і міфічнага па змесце перыяду гісторыі чалавецтва, так званага сімвалічнага варыянту ідэалу, уяўленне ж пра былую дасканаласць звязваецца імі з дакладнымі гістарычнымі перыядамі найвышэйшага шчасця, росквіту і дабрачыннасці ў адносна недалёкім мінулым роднага краю. Спробы ідэалізацыі канкрэтна гістарычнага перыяду прасочваецца ў «Спевах пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» Я. Чачота. У сваёй прадмове аўтар сцвярджае, што кожны народ «шукае ў попеле мінуўшчыны сваю славу, свае асаблівасці, даказвае, што і ён заслугоўвае пашаны з боку іншых» [6. с. 126]. Такім чынам, у дадзеным зборніку пісьменнік паспрабаваў адлюстраваць у якасці ідэальнага канкрэтна гістарычны перыяд існавання Вялікага Княства Літоўскага:

Пазайздросцілі Літве ўсе,
Што жыве шчасліва [5, с. 127].

У свой час Ё. Хёйзінга ў артыкуле «Пра гістарычныя жыццёвыя ідэалы» падкрэсліў значнасць памяці пра сапраўднае мінулае, паколькі менавіта пры даставернай інтэрпрэтацыі гістарычны змест

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэалу ўзрастае і ён становіцца больш вызначаным і акрэсленым [6, с. 274]. Калі ў Я. Баршчэўскага прасочваецца ідэалізацыя мінулага ў сувязі з кансерватыўным светапоглядам большасці яго герояў, пры гэтым дакладныя часавыя характарыстыкі такога ідэальнага часу адсутнічаюць (маецца толькі намёк на тое, што лепшыя часы ўжо мінулі), Я. Чачот пры дапамозе ўзгадвання канкрэтна гістарычных персанажаў і ў пэўнай ступені ідэалізуючы іх дзеянні і ўчынкі спрабуе адлюстраваць веліч і адмысловую дасканаласць акрэсленай эпохі. Для прыкладу можна прыгадаць гістарычна дакладныя вобразы Гедыміна, Альгерда, Радзівіла:

Хто пустэльняй край свой зробіць,
Той не варты згадкі.
Хто ж яго ўзвысіць, будуць
Помніць і нашчадкі [5, с. 141].

Прадстаўнікі рамантычнай традыцыі абіралі мінуўшчыну ў якасці свайго ідэалу і падсвядомай да яго цягі з выразнай мэтай пераўтварыць недасканалае жыццё ў цяперашнім часе адпаведна гэтым ідэалам. Па меркаванні згаданага ўжо Ё. Хёйзінга, калі на ідэал дасканалага шчасця пачынаюць паглядаць як на незваротна страчаны, узнікае патрэба жыць, імкнучыся і прытрымліваючыся менавіта гэтага ідэалу [6, с. 275].

Ідэалізацыя блізкага свету дзяцінства і адносна недалёкага мінулага яскрава прасочваецца і ў творчасці А. Міцкевіча. Аднак гэтую ідэалізацыю наўрад ці варта тлумачыць як імкненне паэта вярнуць гэты свет. Хутчэй ён прагне знайсці ў нядаўнім мінулым тыя каштоўнасці, якія не павінны быць страчаныя ні пры якіх варунках. Менавіта таму ў яго творчасці пастаянна гучыць матыў вяртання. Вяртаецца ў дом свайго дзяцінства пасля вучобы Тадэвуш з аднайменнай паэмы, вяртаецца да даўнейшых звычаяў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падкаморы, вяртаецца да сямейнай генеалогіі і пытання прынадлежнасці замку Граф [2], вяртаецца на радзіму, каб адпомсціць за яе ганьбаванне, Конрад Валенрод. Адсюль вынікае, што ідэал мінуўшчыны ў творчай спадчыне А. Міцкевіча набывае выразную функцыю адраджэння, абуджэння народа.

Такім чынам, ідэал мінуўшчыны, які выступае адным з дамінуючых аб’ектаў духоўнай культуры ў творчай спадчыне прадстаўнікоў беларуска-польскага рамантызму, выступае своеасаблівым жыццёвым арыенцірам, дасканалым узорам існавання, паколькі, нягледзячы на сваю сканструяванасць з дасягненняў мінулага, якія пазнаюцца і каштоўнасна асэнсоўваюцца творцамі, усё-такі валодае пэўнай перспектывай, бо падказвае, як чалавеку і людской супольнасці трэба жыць і на што арыентавацца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


1. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.

2. *Міцкевіч, А.* Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве : шляхецкая гісторыя 1811–1812 гг. у 12-ці кн. вершамі / А. Міцкевіч. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 367 с.

3. *Сорокин, П. А.* Социальная и культурная динамика / П. А. Сорокин. – М. : Астрель, 2006. – 1176 с.

4. *Уладыкоўская, Л.* Духоўныя ідэалы ў сучаснай культуры Беларусі і каштоўнасці глабалізму / Л. Уладыкоўская. – Мінск : БДУ, 2009. – 199 с.

5. *Хёйзинга, Й.* Homo Ludens: статьи по истории культуры / Й. Хёйзинга. – М. : Прогресс : Традиция, 1997. – 416 с.

6. *Чачот, Я.* Свіцязь : выбраныя творы / Я. Чачот. – Мінск : БелЭн, 1999. – 220 с.